Рэзананс

## «Недзе ў далёкай Грузіі жылі бацькі, якія не дачакаліся сына»

**Найперш прызнаюся, што «Звязду» я выпісваю ўсё сваё сталае жыццё. Шмат у газеце патрэбнага, цікавага.**
**Апошнім часам з жалем і смуткам, з гонарам за нашых продкаў чытаю матэрыялы на ваенную тэматыку, а чарговы з іх — Ларысы Карасінай «Экіпажы, якія адляцелі ў вечнасць» («Звязда», 17 ліпеня) прымусіў нават сесці за пісьмо.**

Справа ў тым, што ў маленстве я не раз чула і ад таты Рыгора Сцяпанавіча Шусты, і ад яго брата (а майго, значыць, дзядзькі Васіля), і ад суседзяў, што ў першыя дні вайны за вёскай, непадалёк ад лесу быў падбіты наш самалёт, што спікіраваў ён у балота і лётчык загінуў.

Мясцовыя жыхары пахавалі яго, дакументы схавалі ў некага пад страхой у надзеі, што вайна хутка скончыцца і тады можна будзе напісаць сям'і, дзе абарвалася жыццё дарагога чалавека, дзе ён знайшоў свой апошні прытулак.

Але ж вайна зацягнулася, паперы, відаць, спарахнелі. Самалёт (дакладней — тое, што ад яго засталося) людзі часткова разабралі, а балота затым асушылі...

Атрымліваецца, што нічога як быццам не засталося. Хіба што памяць?

...Мне гэта гісторыя не дае спакою ўсё жыццё. І чым далей па часе тыя падзеі, тым часцей прыходзяць думкі аб тым, што недзе ў далёкай Грузіі (казалі, што лётчык быў грузін) жылі бацькі, якія не дачакаліся свайго сына, жыла яго ўдава (калі быў жанаты?), яго браты і сёстры... А можа, і сёння жывуць яго нашчадкі?..

Вельмі хочацца спадзявацца, што аўтарку артыкула «Экіпажы, якія адляцелі ў вечнасць» зацікавіць мой ліст. І, вядома ж, буду вельмі ўдзячная, калі ўдасца хоць нешта зрабіць, для таго каб аднавіць яшчэ адну старонку ў гісторыі апошняй вайны і захаваць памяць.

**Алена Панцялеева,**
*в. Вайнілавічы, Нясвіжскі раён.*

На сваёй зямлі

## ПАД СІЛУ ЛЮБЫЯ НАГРУЗКІ

**Не так даўно ў Ашмянскі раённы аддзел культуры прыйшла добрая навіна: пераможцай конкурсу «Найлепшы па прафесіі» сярод настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў стала Святлана Шыдлоўская, выкладчыца нашай, Гальшанскай.**

Парог яе дзяўчынка пераступіла даўно — у васьмігадовым узросце. Азы нотнага пісьма і ігры на баяне спасцігала спачатку ў сваіх бацькоў Іны Мікалаеўны і Уладзіміра Паўлавіча. Потым была вучоба ў Лідскім музычным каледжы, дзе найбольш запомніліся ўрокі сапраўдных прафесіяналаў Тамары Пятроўны Харашылавай (спевы) і Бэлы Аронаўны Дбілянскай (сальфеджыа), універсітэт культуры і шчаслівае вяртанне дамоў, у сваю ж Гальшанскую школу мастацтваў.

Штогод яе з задавальненнем наведваюць дзеці не толькі гэтага мястэчка, але і найбліжэйшых вёсак. Як адзначае Святлана Уладзіміраўна (а сёння яна ўжо кіраўнік гэтай установы), школа сама рыхтуе сабе кадры. Ужо чацвёра выпускнікоў працуюць тут выкладчыкамі, яшчэ некалькі — вучацца пакуль у каледжах.

...Новая пасада, вядома ж, запатрабуе ад Святланы Уладзіміраўны вырашэння многіх дадатковых адміністрацыйных і гаспадарчых спраў, але на гэта дырэктар не скардзіцца. Яна лічыць, што чалавеку, які займаецца любімай справай, пад сілу любыя нагрузкі.

...Што цікава, першым дырэктарам школы мастацтваў у Гальшанах быў бацька Святланы Уладзіміраўны, а цяпер ігру на скрыпцы тут жа не без поспехаў спасцігае яе дзевяцігадовы сын Цімафей — пераможца многіх (яшчэ і міжнародных!) творчых конкурсаў.

**Мікалай Балыш,**
*г. Ашмяны.*

Наш клопат

## НЕЛЬГА БЫЦЬ ЗЛАЧЫНЦАМ У АДНОСІНАХ ДА САМОГА СЯБЕ
### і да людзей, якія знаходзяцца побач

**Час ад часу ў сродках масавай інфармацыі з'яўляюцца паведамленні аб дарожна-транспартных здарэннях, нават трагедыях, прычынай якіх становяцца навушнікі.**

І гэта не дзіва, бо людзей, што карыстаюцца імі, усё больш і больш, асабліва сярод маладых. Яны часта імкнуцца адасобіцца ад іншых — жыць, што называецца, на сваёй хвалі (слухаць тую ж музыку). І тады цалкам засяроджваюцца на сваім унутраным стане, адыходзяць ад рэальнасці — зусім не чуюць таго, што гучыць побач, у тым ліку і сігналаў транспарту.

Найбольшую трывогу выклікаюць дзеці. А калі яны з навушнікамі ды яшчэ і на роліках, веласіпедах, скейтбордах ды іншых модных сёння сродках перамяшчэння, то небяспека ўзрастае ў разы, як для іх саміх, так і для ўсіх, з кім яны сустрэнуцца. Праўда, дзеці да пары да часу гэтага не разумеюць, таму клопат дарослых — расказаць, растлумачыць, упэўніць, што нельга быць злачынцам у адносінах да самога сябе і да людзей, якія знаходзяцца побач.

Апроч таго, моцны гук вельмі шкодны для вуха. А калі ён яшчэ і працяглы...

Як вядома, сучасныя дзеці могуць не здымаць навушнікі па некалькі гадзін у дзень і тым самым псаваць свой слых, які потым, на жаль, ніколі не адновіцца.

**Алена Цывілька,**
*аг. Мокрае, Быхаўскі раён.*

Што бачу...

## «Мусіць, нешта ўпусцілі мы ў выхаванні дзяцей?»

**Сужэнцы Галіна Іванаўна і Анатоль Пятровіч — людзі ў нас паважаныя і, можна сказаць, шчаслівыя (ва ўсякім разе, былі...): усё жыццё сумленна працавалі, ладзілі паміж сабой, гадавалі дачку. Адна яна ў іх, пястушка. Але ж добра вучылася ў школе, паступіла ў сталічны ўніверсітэт, выйшла замуж. Тата з мамай дапамаглі маладой сям'і купіць у Мінску кватэру, і як быццам усё, што патрэбна для шчаслівага жыцця. Цяпер яны марылі хіба пра ўнукаў, але...**

«Ты б пагаварыла з дачкой, — даручаў Пятровіч сваёй палавіне, — папытала, што яны сабе думаюць? Можа, крый бог, нездаровыя? Дык лячыцца ж трэба». — «Не, — уздыхала ў адказ Іванаўна, — са здароўем усё нібыта нармальна. Проста хочуць пажыць для сябе. Кацяня вось купілі, каб весялей было. Котку... Дзіянай назвалі».

Ішлі гады, Дзіяна тая расла, і не было, здаецца, «сеанса сувязі», каб дачка не расказала пра яе маме, а тая — суседцы... Яшчэ і новыя здымкі неяк стала паказваць.

І тут Пятровіч не вытрымаў. Сказаў: «Знайшла чым хваліцца: ах, Дзіяначка, ах, разумніца-прыгажунька!.. У маладых каціныя мазгі — на выхаванне кошкі найлепшыя гады свае трацяць, а ў цябе?.. Ды вочы б мае не бачылі гэтай дураты!»

Іванаўна ад бяды падалей закрыла свой смартфон, з крыўдай зірнула на мужа.

— Не сварыцеся, даражэнькія, — спыніла іх суседка. — Цяперашнім часам то каціныя, то сабачыя мазгі ў многіх маладых сужэнцаў. Мусіць, нешта ўпусцілі мы ў выхаванні дзяцей...

Пакінуўшы ў хаце пытанне, суседка сышла дадому. Гаспадары засталіся — шукаць адказ.

**Ніна К.,**
*г. Петрыкаў.*

Як гэта было

## «...ЛІЧЫЦЬ ВУЧЫЛІСЯ З ДАПАМОГАЙ ГІЛЬЗАЎ»

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны як каштоўная рэліквія захоўваецца ліст сакратара ЦК ЛКСМБ К. Т. Мазурава з паведамленнем, што камсамольцы партызанскага атрада Мікалая Розава сабралі па вёсках... 150 алоўкаў, некалькі падручнікаў і дзясяткі сшыткаў.**
**Усё гэта было вельмі патрэбнае, бо ў партызаны сыходзілі цэлымі вёскамі, сем'ямі — са старымі і дзецьмі...**

Той жа Кірыла Трафімавіч Мазураў у кнізе «Незабыўнае» згадваў, што стварэнне школ у лясах ішло поўным ходам і служыла не толькі аб'яднанню і выхаванню дзяцей, — умацоўвала веру ў часовасць акупацыі.

Што да цяжкасцяў, то ў дзяцей не было ні патрэбных для вучобы памяшканняў, ні падручнікаў, ні паперы... На дапамогу прыходзілі хіба знаходлівасць ды мудрасць партызанаў. З кары дуба яны выразалі для першакласнікаў літары для азбукі, укінуты ў адвар жалудоў ржавы цвік даваляў атрымаць чарніла, з дапамогай гільзаў малыя вучыліся лічыць, а пісалі на ўпаковачнай паперы, адваротных баках нямецкіх лістовак ці проста палачкамі на пяску. Настаўнікі-партызаны, не маючы падручнікаў, карысталіся ў рабоце з вучнямі тэкстамі з газет, загадамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, зводкамі інфармбюро.

Камандзір партызанскага злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны, Герой Савецкага Саюза, палкоўнік Р. Н. Мачульскі ў мемуарах «Вечны агонь» адзначаў, што атрадам, якія рыхтаваліся да аперацый па разгроме варожых гарнізонаў, даваліся дадатковыя заданні: даставаць сшыткі і пісьмовыя прылады. Даслоўна: «Аднойчы ноччу камсамольцы з атрада Розава Л. Бярнацкі, А. Залаты і іншыя праніклі ў Слуцк у школу, створаную фашыстамі, і захапілі шмат каштоўных трафеяў: сшыткі, алоўкі, чарніла, глобус, насценны гадзіннік. 1 кастрычніка 1942 года ў школе прагучаў першы званок».






Найбольшае распаўсюджанне лясныя школы атрымалі ў Баранавіцкай і Брэсцкай абласцях, дзе іх было каля 20.

...У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны рэгулярна праводзяцца інтэрактыўныя заняткі, падчас якіх падлеткі маюць магчымасць «апынуцца» ў партызанскім лагеры, стаць вучнямі «Лясной школы».

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

## Аперацыю вялі 13 спецыялістаў

**Тады пра тыя падзеі пісалі ўсе газеты, распавядалі радыё і тэлебачанне: з 4 да 11 жніўня 1970-га на адной з самых бойкіх магістраляў Брэст — Масква ў 22 спецыяльна выкапаных немцамі калодзежах выяўлены авіяцыйныя бомбы, а побач з імі — 48 скрынак з узрыўчаткай.**

Работы па рамонце дарогі, як успамінаў Дзмітрый Шкурапата (тады — старшы лейтэнант), былі тут жа спынены. Аперацыю па размініраванні вялі 13 спецыялістаў: Алег Рукавішнікаў, Ваха Ісхаджыеў, Аляксандр Плотнікаў, Віктар Козыраў і іншыя... Небяспечны груз, агульная вага якога склала 3600 кілаграмаў, узарвалі непадалёк ад вёскі Шалашына.

...Другая сусветная вайна пакінула пасля сябе шмат небяспечных боепрыпасаў. І тысячы іх за 30 гадоў службы абясшкодзіў падпалкоўнік у адстаўцы Дзмітрый Шкурапата.

**Сяргей Жукаў, афіцэр запасу,**
*г. Мінск.*